# ТВОРЧА-ЭСТЭТЫЧНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ ВОБРАЗА-СІМВАЛА ВАСІЛЬКА Ў ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТАЎ

Н. М. БОРСУК

*УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт», Брэст, Беларусь*
*borsnina@yandex.by*

**Уводзіны.** Аб’ектам даследавання з’яўляецца раслінная сімволіка, на прыкладзе кветкі «васілёк», як элемента ўніверсальнага знакавага комплексу. Канцэпцыя фарміравання сімволікі беларускай нацыянальна-фальклорнай традыцыі, якая адыгрывае важнейшую сэнсава-кампазіцыйную ролю ў літаратурных тэкстах, дастаткова актуальна ў сучасным літаратуразнаўстве. Мэта нашай працы – прасачыць творча-эстэтычную трансфармацыю вобраза-сімвала васілька ў творчасці беларускіх паэтаў. Мэта рэалізуецца праз вырашэнне наступных задач: высветліць семантычны патэнцыял аб’екта прыроднага асяроддзя – кветкі «васілёк»; вызначыць ролю кветкі валошкавага колеру як універсальнага сродку для сімвалізацыі розных сітуацый і з’яў; для выяўлення псіхаэмацыянальнага стану душы чалавека.

**Матэрыялы і метады.** Базіснымі для аўтара даследавання сталі працы А. Ліса, Л. Салавей, Н. Гілевіча, У. Конана, А. Ненадаўца І. Швед і інш. вучоных. Высновы абапіраюцца на філасофскую тэорыю сімвала: разуменне мастацкага сімвала як дыялектычнага адзінства прадмета, вобраза і яго ўнутранага значэння, грунтуюцца на выкарыстанні параўнальна-тыпалагічнага метаду.

**Вынікі і абмеркаванне.** З вобразам васілька, які яшчэ нашымі продкамі ўспрымаўся як пасланнік неба на зямлі, глыбока і моцна звязана паэтычнае светаўспрыманне М. Багдановіча. У апісанні і выяўленні сваіх пачуццяў да роднага краю М. Багдановіч звяртаўся да колеру васілька(«Змяіны цар»). З гэтым колерам асацыіруецца ў паэта ноч і нават маладзік («Ціха па мяккай траве»). Сіні колер выклікаў успаміны аб маладосці, каханні («Набягае яно»). Эпітэт «сіні» ужыты ў апошнім развітальным вершы М.Багдановіча («У краіне светлай...»). У эстэтычнай канцэпцыі паэта – гэта ўвасабленне душы народа, сімвал нацыянальнага мастацтва («Слуцкія ткачыхі»). «Васільковы» матыў спатрэбіўся сучасным мастакам слова для сцверджання неаддзельнасці лёсу чалавека і лёсу Радзімы («Vita brevis. Patria eternis» Н. Мацяш). Валошкавы колер становіцца важным чыннікам паміж лірычным героем і яго каханай (цыкл вершаў «Мяжа надзеі» М. Пракаповіча). Вобраз кветкі васільковага колеру дапамагае рэалізаваць нашым сучаснікам філасофска-эстэтычныя ідэі аб духоўным удасканаленні асобы («У вераснёвым полі» Н. Мацяш), грамадства (Я. Збажына «Дзве ружы ў вазе», «Залежнасць» З. Дудзюк), аб пераемнасці лепшых традыцый свайго народа («У вянок Любе» Н. Мацяш).

**Заключэнне.** Беларускія паэты праз вобраз васілька здолелі ўвасобіць багаты дыяпазон думак, перажыванняў, пачуццяў, пачынаючы ад глыбока патрыятычных, агульначалавечых да асабіста інтымных. Гэта сведчыць аб філасофскім, ідэйна-эстэтычным паглыбленні сучаснай паэзіі.